# МОЛАДЗЕВАЯ ПЛАТФОРМА БХД/МХД

## Рэзюмэ

«Моладзевая платформа МХД» - гэта праграма рэальных зменаў, скіраваная на падтрымку, уключэнне і самарэалізацыю беларускай моладзі ва ўмовах аўтарытарнай сістэмы, крызісу адукацыі, масавай эміграцыі і страты даверу да палітыкі. Яна распрацаваная арганізацыяй Маладыя хрысціянскія дэмакраты (МХД) і базуецца на прынцыпах свабоды, адказнасці, справядлівасці, салідарнасці і субсідыярнасці.

У дакуменце прааналізаваныя 7 асноўных выклікаў, з якімі сутыкаюцца маладыя беларусы: ад падмены выбару і адсутнасці рэальных перспектыў да ідэалагічнага ціску, эміграцыі і ізаляцыі ад палітычных працэсаў.

У адказ МХД прапануюць 7 кірункаў зменаў:

1. 1. Адукацыя: рэформа сістэмы адукацыі на аснове якасці, акадэмічнай свабоды і беларускай ідэнтычнасці.
2. 2. Першае працаўладкаванне: справядлівы доступ да працы праз стажыроўкі, ментарства і сацыяльныя ліфты.
3. 3. Самакіраванне: аднаўленне і рэальная аўтаномія студэнцкіх і школьных самакіраванняў.
4. 4. Ініцыятывы: падтрымка моладзевых праектаў праз гранты, хабы, інкубатары і мікрафінансаванне.
5. 5. Культура і медыя: развіццё прастораў для самарэалізацыі, падтрымка беларускамоўнага і незалежнага кантэнту.
6. 6. Палітычны ўдзел: уключэнне моладзі ў прыняцце рашэнняў на ўсіх узроўнях - ад моладзевых саветаў да парламента.
7. 7. Моладзь у эміграцыі: стварэнне каналаў сувязі з Беларуссю, удзелу ў стратэгіях зменаў і падтрымкі новых лідараў.

Платформа завяршаецца пералікам інструментаў, партнёраў і механізмаў, праз якія гэтыя ідэі могуць быць рэалізаваныя: ад міжнародных праграм і фондаў да супрацы з універсітэтамі, дэмакратычнымі структурамі і моладзевымі сеткамі.

## Структура і логіка дакумента

### Уводзіны

- навошта гэтая платформа;
- каму яна адрасаваная;
- што мы прапануем.

### I. Нашы каштоўнасці і прынцыпы

Прынцыпы хрысціянскай дэмакратыі, адаптаваныя пад моладзевы кантэкст:

- асоба - у цэнтры палітыкі;
- свабода і адказнасць;
- салідарнасць і справядлівасць;
- субсідыярнасць з прыкладамі для моладзі: універсітэты, студсаветы, медыя;

- месца хрысціянскіх каштоўнасцей у свецкай палітыцы.

## II. 7 выклікаў, якія змяняюць жыццё моладзі

8. 1. Жыццё «паводле сцэнару» - выбар без выбару, лаяльнасць важнейшая за здольнасці.
9. 2. Няма перспектывы пасля вучобы - ні працы, ні падтрымкі, ні ліфтаў.
10. 3. Адсутнасць голасу - забароны, цэнзура, самакіраванне для галачкі.
11. 4. Нуль падтрымкі ініцыятывы - усё праз дазвол, страх і падазронасць.
12. 5. Ідэалагічны ціск - школьная «гісторыя», БРСМ, прымус да ўдзелу.
13. 6. Два паралельныя светы - моладзь у краіне і моладзь у эміграцыі: разрыў.
14. 7. Разрыў паміж моладдзю і дэмакратычнымі сіламі.

## III. Наша візія: Беларусь - краіна магчымасцяў для моладзі

- не лозунг, а канцэпцыя: як будзе выглядаць сістэма падтрымкі, удзелу і самарэалізацыі;
- антытэза цяперашняй мадэлі;
- падкрэсліванне ролі маладога чалавека як суб'екта, а не аб'екта.

## IV. Што і як мы прапануем: 7 кірункаў зменаў

Кожны блок уключае апісанне праблемы, міжнародную практыку і прапанову рашэнняў:

15. 1. Адукацыя: адкрытая, сучасная, з беларускім і еўрапейскім кантэкстам.
16. 2. Першае працаўладкаванне: празрыстыя правілы, сацыяльны ліфт, падтрымка ініцыятывы.
17. 3. Студэнцкае і школьнае самакіраванне - рэальнае, не дэкаратыўнае.
18. 4. Падтрымка ініцыятыў: ад міні-грантаў да моладзевых інкубатараў.
19. 5. Культура, мова і медыя - месца для самарэалізацыі і свабоды.
20. 6. Палітычны ўдзел моладзі - не «пасля 30», а з першых крокаў.
21. 7. Моладзь у эміграцыі: каналы ўплыву, падтрымка, сувязь з Беларуссю.

## V. План дзеянняў

22. 1. Крок 1: сетка камунікацыі моладзевых ініцыятыў.
23. 2. Крок 2: альтэрнатыўныя адукацыйныя платформы: гісторыя, грамадзянская асвета.
24. 3. Крок 3: сістэма малых грантаў і ментарства для праектаў.
25. 4. Крок 4: уключэнне беларускай моладзі за мяжой у адзіную платформу ўдзелу.
26. 5. Крок 5: публічныя маніфесты, дэкларацыі і ўплыў на міжнародны ўзровень.

## VI. Фінансаванне і супрацоўніцтва

- дзе браць рэсурсы: партнёрства, інвестыцыйныя праграмы, еўрапейскія фонды;
- празрыстасць, конкурснасць, незалежныя камісіі;
- роля мясцовага самакіравання і моладзевых НДА.

## VII. Міжнародныя практыкі, якія можна ўжыць у Беларусі

- Германія: Jugendparlament, Jugendhilfe, FSJ;
- Польшча: Rada Dzieci i Młodzieży, Wolontariat Europejski;
- Скандынавія: бюджэт удзелу, школьныя саветы з паўнамоцтвамі;
- ЕС: Erasmus+, European Solidarity Corps, DiscoverEU, EYP.

### VIII. Заключэнне: час дзейнічаць. Роля моладзі ў новай Беларусі

- хто і як можа ўдзельнічаць;
- дзе мы пачынаем ужо сёння;
- не чаканне - дзеянне.

# Уводзіны

Гэтая платформа створаная для тых, хто хоча не толькі «чакаць пераменаў», але і дзейнічаць. Для тых, хто стаміўся ад пустых словаў і хоча бачыць рэальныя крокі. Для моладзі, якая жыве ў Беларусі і за яе межамі, вучыць мовы, будуе праекты, шукае сябе і не хоча быць часткай «страчанага пакалення».

Мы, Маладыя хрысціянскія дэмакраты (МХД), сабралі ў гэтым дакуменце тое, што лічым важным і рэальным: праблемы, пра якія звычайна маўчаць; шляхі, якія магчыма прайсці; і механізмы, якія ўжо працуюць у іншых краінах і могуць быць адаптаваныя для Беларусі.

Гэта інструмент, з якім можна ісці на дыскусію, запускаць праект, рыхтаваць змены. Мы не абяцаем «універсальных рэцэптаў», але прапануем тое, што можа працаваць тут і цяпер - на тваім узроўні, у тваёй супольнасці, у тваім жыцці.

Мы не абяцаем «лёгкай будучыні» праз лозунгі. Замест гэтага мы аналізуем выклікі, з якімі сутыкаецца моладзь, і прапануем шляхі, як маладыя людзі могуць самі стаць суб'ектамі пераменаў.

Гэтая платформа адрасаваная:

- студэнтам, якія хочуць вучобы з сэнсам і ўдзелу ў прыняцці рашэнняў;
- тым, хто стварае сям'ю, працуе або толькі шукае сябе;
- тым, хто вымушана з'ехаў, але не адмовіўся ад Беларусі;
- тым, хто стаміўся ад цынізму і хоча мець сапраўдны ўплыў на будучыню краіны.

Мы верым: калі змены пачынаюцца з удзелу, значыць, менавіта моладзь павінна быць у цэнтры гэтых зменаў. І менавіта таму гэты дакумент - інструмент, а не сімвал.

# I. Нашы каштоўнасці і прынцыпы

## Хто мы

Мы - Маладыя хрысціянскія дэмакраты (МХД). Мы не палітыкі «старога тыпу» і не молімся на лозунгі. Мы прадстаўляем новае пакаленне, якое хоча не абяцанняў, а зразумелых прынцыпаў, на якіх можна будаваць будучыню - і сваю, і краіны.

Мы за тое, каб палітыка служыла чалавеку, а не чалавек палітыцы. За годнасць, выбар, самастойнасць. Мы - за моладзь, якая хоча ўплываць, а не проста «ўдзельнічаць».

## Нашы прынцыпы

### 1. Асоба ў цэнтры

Ні дзяржава, ні партыя, ні ідэалогія не могуць быць важнейшымі за асобу. Кожны чалавек мае права на самарэалізацыю, годнае жыццё і павагу - незалежна ад паходжання, перакананняў, мовы, полу або сацыяльнага статусу.

### 2. Свабода і адказнасць

Ты можаш выбіраць, як жыць. Але разам з гэтым ты прымаеш адказнасць за наступствы. Грамадства, у якім людзі свабодныя, - гэта грамадства, у якім кожны гатовы адказваць за сябе, за супольнасць, за краіну.

### 3. Справядлівасць

Усе павінны мець роўны шанец - у адукацыі, на рынку працы, у грамадскай дзейнасці. Не сувязі, не лаяльнасць, не «родначныя адносіны», а здольнасці, ідэі, праца. Гэта пра магчымасці, а не пра фіктыўную роўнасць.

### 4. Салідарнасць

Калі хтосьці мае менш шанцаў, мы павінны падтрымаць. Не з літасці, а таму што без гэтага няма супольнасці. Сацыяльная падтрымка, інклюзія, узаемападтрымка - гэта не тое, што «расслабляе», а тое, што робіць грамадства мацнейшым.

### 5. Субсідыярнасць

Рашэнні павінны прымацца на тым узроўні, дзе яны найлепш разумеюцца і могуць быць рэалізаваныя. Гэта значыць: больш самакіравання для школ і ВНУ, больш аўтаноміі ў супольнасцях, менш «указанняў зверху». Напрыклад, студэнцкая супольнасць сама павінна вырашаць, як выглядае студэнцкае жыццё, а не выконваць указанні Міністэрства.

### 6. Рэальная вера, а не рыторыка

Мы не будзем разбураць светапогляд маладых людзей маралізатарствам. Але хрысціянская дэмакратыя - гэта не пра «забароны», а пра бачанне чалавека як істоты, здольнай любіць, будаваць і несці адказнасць. Гэта каштоўнасці, якія не навязваюцца, а выбіраюцца. І мы самі іх выбралі.

# II. 7 выклікаў, якія змяняюць жыццё моладзі

## 1. Жыццё «паводле сцэнару»: выбар без выбару

Шмат хто з маладых людзей у Беларусі сутыкаецца з сітуацыяй, калі ўсе асноўныя рашэнні - чаму вучыцца, дзе працаваць, як будаваць жыццё - ужо нібыта прынятыя без іх удзелу. Абіраеш факультэт, але выкладаюць не тое, што абяцалі. Ідзеш на працу, але без «сувязяў» ці «пратэкцыі» шанцаў няма. Калі хочаш змяніць правілы гульні, а не толькі прыстасавацца да іх, сутыкаешся са сценай: сістэма цябе не бачыць.

Беларуская дзяржава трактуе моладзь не як самастойных суб'ектаў з ідэямі, патрэбамі і марай, а як аб'екты, якіх трэба «правільна выхаваць» і «прыстасаваць да патрэб краіны». Малады чалавек адчувае, што яго шлях ужо прадвызначаны. Гэта зніжае матывацыю, павялічвае стрэс, стварае ўнутранае адчуванне бяссілля.

У дэмакратычнай краіне моладзь - не аб'ект, а суб'ект з поўным правам на ўдзел у планаванні свайго жыцця, адукацыі, прафесіі і будучыні.

## 2. Пасля ўніверсітэта - нікуды

Беларускія выпускнікі ВНУ часта сутыкаюцца з безвыходнасцю: годнай працы няма, падтрымкі маладых спецыялістаў не існуе, а перспектывы - ці пераезд, ці праца «дзе возьмуць». Афіцыйныя

праграмы размеркавання - перажытак савецкага часу, які нярэдка становіцца інструментам пакарання, а не дапамогі.

Кампаніі і арганізацыі, у тым ліку дзяржаўныя, мала зацікаўленыя ў маладых спецыялістах без досведу і не гатовыя інвеставаць у навучанне «з нуля». У выніку тысячы выпускнікоў штогод з'язджаюць з краіны або пераходзяць у нефармальны, несістэмны сектар працы.

Падтрымка маладых спецыялістаў праз сістэму практыкі, стажыровак, ментарства, персаналізаваных адукацыйных трэкаў - гэта норма ў большасці еўрапейскіх краін. Беларусь можа зрабіць так, каб першае працоўнае месца стала не тупіком, а стартам.

## 3. Моладзь пазбаўленая права голасу

Студэнцкія і школьныя самакіраванні, якія павінны быць інструментам уплыву і ўдзелу, часта існуюць толькі на паперы. Універсітэцкія адміністрацыі падпарадкоўваюцца палітычным інструкцыям, а не патрэбам навучэнцаў. Людзей з актыўнай пазіцыяй выклікаюць на «гутаркі», пазбаўляюць стыпендый, выключаюць або шантажуюць размеркаваннем. У школах дзейнічаюць забароны на ініцыятывы, цэнзура на тэмы гісторыі, грамадзянскай супольнасці, правоў чалавека.

Моладзь не мае рэальнага канала для выказвання, звароту і супрацы. Гэта спараджае нявер'е ў самі механізмы ўдзелу.

У дэмакратычным грамадстве малады чалавек не павінен баяцца сказаць: «Я лічу інакш». Сучасныя еўрапейскія мадэлі падтрымліваюць школьныя і студэнцкія парламенты, моладзевыя саветы пры мэрыях і нават удзел у рашэннях на нацыянальным узроўні.

## 4. Сістэма супраць ініцыятывы

Любая ініцыятыва ў Беларусі трактуецца як падазроная. Каб правесці акцыю, сустрэчу ці медыяпраект, патрэбныя дазволы, дакументы, апекуны і гарантыі. У выніку моладзь вучыцца не таму, як ствараць, а таму, як «правільна афарміць». Гэта забівае творчасць і пазітыўную рызыку.

У заходніх краінах існуюць механізмы хуткай падтрымкі малых праектаў - ад бюджэту ўдзелу да муніцыпальных грантаў. Там не патрабуюць «інструкцыю № 37/пэ». Дастаткова ідэі, адказнай асобы і празрыстасці.

## 5. Ідэалагічны ціск і індактрынацыя

Пачынаючы са школы, моладзі ў Беларусі прапануецца толькі адна інтэрпрэтацыя гісторыі, палітыкі, культуры. У многіх школах існуе прымус да ўступлення ў БРСМ або іншыя праўладныя структуры, удзел у ідэалагічных мерапрыемствах робіцца абавязковым. Людзі, якія адмаўляюцца, атрымліваюць санкцыі - ад адміністратыўных «гутарак» да перашкод у паступленні ці працаўладкаванні.

Універсітэцкая аўтаномія, еўрапейскі падыход да адукацыі, шырокі спектр поглядаў у падручніках - гэта не раскоша, а стандарт для свабодных краін. Моладзі трэба не вучыцца думаць «як трэба», а вучыцца думаць самастойна.

## 6. Моладзь у эміграцыі: ізаляцыя і стратэгічны вакуум

Сотні тысяч маладых беларусаў сёння жывуць за мяжой. Яны засталіся без падтрыманай сувязі з краінай, без інтэграцыі ў нацыянальныя праекты, без бачання сваёй ролі ў будучыні Беларусі.

Часта гэта людзі з добрай адукацыяй, энергіяй, ініцыятывай, але яны не бачаць каналаў, праз якія могуць паўплываць. Частка інтэгруецца ў грамадскае жыццё замежных краін і губляе сувязь з Беларуссю. Іншыя застаюцца «паміж».

Наша задача - не толькі падтрымаць моладзь у эміграцыі, але і стварыць механізмы ўдзелу: медыя, адукацыйныя праграмы, каналы зваротнай сувязі, удзел у дэмакратычных дыскусіях пра будучыню краіны.

### 7. Разрыў паміж моладдзю і дэмакратычнымі сіламі

Асобны выклік - адсутнасць уключэння моладзі ў стратэгічныя рашэнні нават у дэмакратычным асяроддзі. Частка ініцыятыў і арганізацый, што называюць сябе дэмакратычнымі, захоўвае іерархічную, «дарослую» структуру, у якой маладыя людзі выконваюць тэхнічныя ролі або не ўдзельнічаюць наогул.

Гэта прыводзіць да страты цікавасці, даверу і ініцыятывы сярод маладых лідараў. Моладзь не хоча быць дэкаратыўным дадаткам да ўжо прынятых рашэнняў. Яна гатовая ўдзельнічаць, але патрабуе рэальнага месца і адказнасці.

Адна з нашых стратэгічных прапаноў - стварэнне камунікацыйнай пляцоўкі паміж моладдзю і дэмакратычнымі сіламі, дзе рашэнні будуць фармавацца разам, а не «перадавацца зверху».

## III. Наша візія: Беларусь - краіна магчымасцяў для моладзі

Мы разглядаем Беларусь будучыні як краіну, якая дае моладзі рэальныя шанцы - на адукацыю, працу, самарэалізацыю, удзел у прыняцці рашэнняў, стварэнне сям'і і жыццё без страху. Беларусь як краіну, дзе моладзь - не аб'ект выхавання, а суб'ект пераменаў. Дзе малады чалавек мае магчымасць вучыцца, працаваць, спрачацца, уплываць, ствараць, не з'язджаючы і не здраджваючы сабе.

Гэта комплексны падыход, які супрацьстаіць сённяшняй сістэме кантролю, ідэалагічнай ізаляцыі і сацыяльнага стагнавання.

### 1. Асоба і яе годнасць - у цэнтры палітыкі

Дзяржава - не інструктар, а партнёр. Яна не ўказвае, «як правільна», а стварае ўмовы: гранты, пляцоўкі, доступ да рэсурсаў. Моладзевыя праекты не забараняюць, а падтрымліваюць.

Дзяржаўныя структуры - не «сістэма», а сэрвіс. Школа, універсітэт, ЖЭС, мэрыя - усе гатовыя працаваць праз лічбавыя рашэнні, адкрыта і празрыста, з удзелам грамадзян.

Асноўнае адрозненне ад сённяшняга стану - прызнанне маладых людзей як суб'ектаў грамадскага жыцця. Мы лічым, што кожны чалавек мае права выбару і магчымасці для самарэалізацыі. Дзяржава павінна не вызначаць, «як трэба жыць», а стварыць умовы для розных жыццёвых сцэнарыяў, не абмяжоўваючы ініцыятыву.

### 2. Адукацыя, што рыхтуе да жыцця, а не да падпарадкавання

Адукацыя - жывая і сэнсоўная. Універсітэты маюць акадэмічную свабоду, студэнцкае самакіраванне рэальнае, а студэнты могуць самі вырашаць, што і як вывучаць. Моладзь не «рыхтуюць да жыцця» - ёй ужо даюць магчымасць жыць і дзейнічаць.

У будучай Беларусі адукацыя будзе экасістэмай выбару, якая адкрывае магчымасці, а не зачыняе іх. Універсітэты будуць мець акадэмічную і арганізацыйную аўтаномію, а школьная сістэма будзе заснаваная на прынцыпах крытычнага мыслення, павагі да разнастайнасці і грамадзянскай адказнасці.

- Студэнцкае самакіраванне - рэальны механізм уплыву.
- У школьнай праграме - альтэрнатыўныя погляды, гісторыя без ідэалагічнага ціску, вучэбныя модулі па правах чалавека, медыяпісьменнасці, этыцы.
- Маладыя людзі маюць магчымасць самастойна абіраць навучальныя трэкі, спалучаць навучанне з валанцёрствам або працай, удзельнічаць у міжнародных праграмах: Erasmus+, CEEPUS, Eurodesk і іншых.

## 3. Роўныя шанцы і падтрымка маладой сям'і

Кожны малады чалавек мае магчымасць стварыць сям'ю, не баючыся эканамічнай няпэўнасці:

- жыллёвыя праграмы і іпатэчныя субсідыі для маладых сем'яў;
- даступнасць дзіцячых садкоў, падтрымка бацькоў у водпусках па доглядзе;
- падтрымка прыёмных сем'яў, інклюзіўнасць сямейнай палітыкі;
- моладзевае страхаванне, сем'і з дзецьмі як першачарговы прыярытэт у сацыяльнай падтрымцы.

## 4. Праца і падтрымка ініцыятывы

Праца - гэта развіццё, а не выжыванне. Першая праца - гэта не прыгавор і не падпрацоўка «дзе ўзялі», а частка асабістага трэка. Ёсць ментары, стажыроўкі, падтрымка запуску ўласных праектаў. Прафесійнае навучанне даступнае і гнуткае.

Першае працоўнае месца не павінна быць турмой без шанцаў. У нашай візіі:

- дзяржава і бізнес супольна ствараюць праграмы стажыровак, ментарства, адаптацыі да рынку працы;
- моладзевыя бізнес-інкубатары, стартап-гранты, мікракрэдыты з мінімальным працэнтам;
- сістэма перанавучання і развіцця «мяккіх навыкаў» (soft skills);
- падтрымка сацыяльнага прадпрымальніцтва, асабліва ў сферах адукацыі, экалогіі, інклюзіі і культуры.

## 5. Моладзевы ўдзел і самакіраванне

Удзел - гэта норма. У кожным горадзе ёсць моладзевы савет, у кожным універсітэце - самакіраванне з рэальным уплывам. Моладзь прадстаўленая ў парламенце, у камісіях, у экспертных групах. Яе чуюць - і яна адказвае.

У Беларусі будучыні:

- у кожным горадзе існуюць моладзевыя саветы пры муніцыпалітэтах, якія маюць кансультацыйныя і праектныя паўнамоцтвы;
- школьныя і студэнцкія парламенты рэальна ўплываюць на навучальны працэс;
- прадстаўнікі моладзі з'яўляюцца ўдзельнікамі нацыянальных платформаў і камісій;
- ствараюцца камунікацыйныя пляцоўкі паміж моладдзю і дэмакратычнымі сіламі;
- падтрымліваецца ўдзел у міжнародных форумах, моладзевых парламентах Еўропы і свету.

### 6. Культура, мова, ідэнтычнасць

Культура - не прапаганда, а разнастайнасць. Беларуская мова - жывая і сучасная. Гісторыя - не савецкі міф, а адкрыццё. Блогеры, артысты, стартаперы - гэта не «ваша асабістая справа», а рухальная сіла грамадства.

- Беларуская мова - не прадмет «любімых паэтаў», а мова сучаснай адукацыі, медыя, тэхналогій і жыцця.
- У краіне развіваецца культура памяці, падтрымліваюцца лакальныя ініцыятывы, гістарычныя і мастацкія праекты.
- Моладзевыя культурніцкія прасторы, падтрымка незалежных медыя, блогераў і творчых супольнасцяў.

### 7. Моладзь у эміграцыі - частка супольнасці

Эміграцыя - не страта, а частка сеткі. Моладзь за мяжой - паўнавартасныя ўдзельнікі нацыянальных стратэгій. Яны могуць далучыцца да праграм, ініцыятыў, партнёрстваў. Гэта супольнасць, а не рассеянасць.

Мы бачым беларускую дыяспару не як «страчаную», а як пашырэнне нацыянальнай супольнасці. Для моладзі за мяжой патрэбныя:

- праграмы зваротнай камунікацыі і падтрымкі сувязі з Беларуссю;
- далучэнне да адукацыйных, інфармацыйных і культурных ініцыятыў;
- моладзевыя платформы для ўдзелу ў фармаванні бачання будучыні краіны;
- сетка «амбасадараў Беларусі» сярод маладых людзей у розных краінах.

Гэта - візія, заснаваная на годнасці асобы, салідарнасці і адказнасці. Беларусь - не толькі тэрыторыя. Гэта прастора магчымасцяў для кожнага, хто гатовы ўзяць на сябе ініцыятыву, шукаць шлях і будаваць агульную будучыню.

Так выглядае Беларусь, у якой моладзь сапраўды патрэбная. І мы будзем рухацца да яе - не праз абяцанні, а праз дзеянні.

## IV. Што і як мы прапануем: 7 кірункаў зменаў

### 1. Адукацыя: адкрытая, сучасная, з беларускім і еўрапейскім кантэкстам

Праблема: сённяшняя адукацыйная сістэма ў Беларусі састарэлая, цэнтралізаваная і прасякнутая ідэалагічным кантролем. У школах і ВНУ моладзі навязваецца аднамернае бачанне гісторыі, палітыкі і культуры, адсутнічае развіццё крытычнага мыслення, а навучальныя планы не адпавядаюць выклікам сучаснага свету. Існуе праблема недастатковай аўтаноміі навучальных установаў, недаверу да студэнцкіх галасоў, перагрузкі фармальнымі прадметамі пры недахопе практычна арыентаваных навыкаў.

Міжнародны досвед: у ЕС адукацыя - інструмент развіцця, а не кантролю. Універсітэты аўтаномныя. Студэнты ўдзельнічаюць у прыняцці рашэнняў праз сенаты і саветы. Дзейнічаюць праграмы абмену (Erasmus+), дзе студэнты могуць вучыцца за мяжой. Падтрымліваюцца адукацыйныя ініцыятывы «знізу»: моўныя курсы, лекцыі, нефармальныя школы, праекты па гісторыі, правах чалавека і іншае.

У краінах ЕС актыўна ўкараняецца кампетэнтнасны падыход у адукацыі, які спалучае акадэмічныя веды, практычныя навыкі і сацыяльна-грамадзянскія кампетэнцыі. Напрыклад, у Германіі і Фінляндыі школьнікі вывучаюць правы чалавека, медыяграматнасць, прынцыпы дэмакратыі, мясцовае

самакіраванне. Універсітэты самастойна фарміруюць навучальныя праграмы, студэнцкая аўтаномія заканадаўча гарантаваная. Erasmus+, eTwinning і падобныя праграмы спрыяюць трансгранічнаму навучанню.

Што мы прапануем:

- Аўтаномія школ і ВНУ. Універсітэты і школы павінны самі фарміраваць навучальныя праграмы, уключаць модулі па правах чалавека, грамадзянскай супольнасці, гісторыі і выбіраць формы навучання. Моладзь павінна ўдзельнічаць у вызначэнні зместу адукацыі.
- Дэідэалагізацыя. Адукацыя - не месца для прапаганды. Трэба адмяніць прымус да ўступлення ў праўладныя структуры, аднавіць акадэмічную свабоду і адкрытыя дыскусіі.
- Развіццё нефармальнай адукацыі. Падтрымка моладзевых адукацыйных ініцыятыў, платформаў, анлайн-школ, праграм культурнага і гістарычнага асэнсавання.
- Удзел у еўрапейскіх адукацыйных праграмах. Нават да поўнага далучэння да ЕС Беларусь можа падрыхтавацца да ўдзелу ў Erasmus+, eTwinning, Youthpass і іншых праграмах.
- Моўны баланс. Стварэнне рэальных умоваў для беларускамоўнай адукацыі на ўсіх узроўнях, без дыскрымінацыі і без імітацыі.
- Увядзенне практыкаарыентаваных модуляў. Курсы прадпрымальніцтва, фінансавай граматнасці, экалагічнай адказнасці, медыякампетэнцый - як у школах, так і ў ВНУ.

## 2. Першае працаўладкаванне: празрыстыя правілы, сацыяльны ліфт, падтрымка ініцыятывы

Праблема: большасць беларускіх выпускнікоў сутыкаецца з тым, што дыплом нічога не гарантуе. Сістэма размеркавання - рэшткі савецкага кантролю, які не дапамагае, а карае. Праца па спецыяльнасці часта недаступная, асабліва без «сувязяў». Дзяржава не інвестуе ў маладых спецыялістаў. Гэта падрывае давер, павышае эміграцыю і знішчае матывацыю. Маладыя людзі не бачаць у Беларусі ні ліфтаў, ні будучыні.

Міжнародны досвед: у краінах ЕС працаўладкаванне моладзі - асобны прыярытэт. Працуюць праграмы падтрымкі першага працоўнага месца, напрыклад Youth Guarantee; фінансуюцца стажыроўкі; дзейнічаюць кар'ерныя цэнтры пры ўніверсітэтах; існуюць падатковыя ільготы для бізнесу, які бярэ маладых спецыялістаў. Важна: працоўны досвед набываецца яшчэ падчас вучобы.

Што мы прапануем:

- Адмена прымусовага размеркавання. Замест яго - магчымасць добраахвотнага ўдзелу ў праграмах падтрымкі першага месца працы.
- Муніцыпальныя і галіновыя праграмы стажыровак. Гарадскія ўстановы, НДА, малы і сярэдні бізнес могуць атрымліваць падтрымку за ўдзел у праграмах стажыровак для маладых.
- Цэнтры падтрымкі першай працы. Кожная ВНУ і кожны рэгіён павінны мець цэнтр, дзе малады чалавек можа атрымаць дапамогу: як скласці CV, як знайсці стажыроўку, куды ісці, калі сутыкнуўся з дыскрымінацыяй.
- Інстытуцыяналізацыя ментарскіх праграм. Маладыя людзі павінны мець доступ да ментараў - вопытных спецыялістаў, гатовых кансультаваць і дапамагаць у адаптацыі.
- Падатковыя ільготы для тых, хто прымае маладых спецыялістаў. Гэта стымулюе бізнес і НДА ўключаць моладзь без страху перад «нязручным» досведам.
- Падтрымка самазанятасці. Фінансаванне ініцыятыў для тых, хто хоча сам стварыць сабе працоўнае месца, напрыклад праз мікрагранты, юрыдычную падтрымку, бухгалтарскае кансультаванне.

- Профільная прафарыентацыя і ранняе планаванне. Пачынаючы з 9-10 класа, вучні павінны разумець, дзе і як яны могуць сябе рэалізаваць. Гэта значыць: сучасныя прафарыентацыйныя інструменты, а не савецкія «анкеты».

## 3. Студэнцкае і школьнае самакіраванне - рэальнае, не дэкаратыўнае

Праблема: у Беларусі самакіраванне вучняў і студэнтаў з'яўляецца амаль што імітацыяй. Студэнцкія рады існуюць толькі фармальна, іх склад і дзейнасць кантралюецца адміністрацыяй. У школах любое свабоднае выказванне або ініцыятыва могуць быць прычынай для цэнзуры, вымоваў, «прафілактычных гутарак». Гэта знішчае давер да інстытутаў удзелу, у моладзі фарміруецца пачуццё, што «нічога не залежыць ад нас».

Міжнародны досвед: у многіх краінах ЕС школьныя парламенты, студэнцкія сенаты і моладзевыя рады пры мэрыях з'яўляюцца паўнавартаснай часткай прыняцця рашэнняў. У Германіі, Польшчы, Швецыі і іншых краінах вучнёўскія структуры могуць уплываць на змест адукацыі, размеркаванне бюджэту на школьныя праекты, арганізацыю часу адпачынку і вучобы. Існуе сістэма рэгулярнага ўзаемадзеяння з кіраўніцтвам школ і ўніверсітэтаў.

Што мы прапануем:

- Прызнанне і замацаванне на ўзроўні заканадаўства права студэнцкіх і школьных арганізацый на самастойнасць, выбары і ўдзел у прыняцці рашэнняў.
- Фінансаванне і матэрыяльная падтрымка самакіравання. У бюджэтах установаў адукацыі павінны быць прадугледжаныя сродкі для ініцыятыў студэнцкіх і вучнёўскіх арганізацый.
- Прадстаўніцтва моладзі ў органах кіравання. Абавязковае прадстаўніцтва ў акадэмічных сенатах, педагагічных саветах, саветах установаў - з правам голасу.
- Падрыхтоўка лідараў самакіравання. Праграмы навучання, летнікі, стажыроўкі ў дэмакратычных краінах для школьнікаў і студэнтаў, якія хочуць займацца прадстаўніцтвам сваіх супольнасцяў.
- Увядзенне нацыянальнага форуму школьнага і студэнцкага самакіравання. Гэта пляцоўка для распрацоўкі агульных ініцыятыў, перадачы досведу, развіцця супрацы паміж рэгіёнамі.
- Забарона на пераслед за ўдзел у самакіраванні і выказванне меркавання. Закон павінен гарантаваць, што студэнт ці вучань не можа быць пакараны за сваю грамадзянскую пазіцыю.

## 4. Падтрымка ініцыятыў: ад міні-грантаў да моладзевых інкубатараў

Праблема: у Беларусі ініцыятыва маладых людзей часта сустракае бюракратычны або палітычны бар'ер. Каб правесці грамадскую акцыю, запусціць праект ці зрабіць нешта карыснае для свайго раёна, трэба прайсці праз кола ўзгадненняў, атрымаць дазволы, чакаць «рашэння зверху». З-за гэтага моладзь вучыцца не дзейнічаць, а «не выклікаць падазрэнняў». Гэта душыць творчы імпульс і ініцыятыву, пераўтварае маладых людзей у пасіўных назіральнікаў.

Міжнародныя практыкі: у еўрапейскіх краінах існуе шырокая сістэма падтрымкі моладзевых ініцыятыў:

- у Польшчы і Чэхіі муніцыпалітэты маюць спецыяльныя бюджэты ўдзелу, дзе моладзь сама вырашае, на што выдаткаваць сродкі;
- у Германіі і Нідэрландах дзейнічаюць моладзевыя інкубатары: цэнтры, дзе маладыя людзі атрымліваюць кансультацыі, трэнінгі, месца для працы і мікрагранты;
- еўрапейская праграма Erasmus+ і European Solidarity Corps забяспечваюць фінансаванне лакальных праектаў з сацыяльным або культурным складнікам.

Прапановы МХД:

- Увядзенне міні-грантавай сістэмы для моладзі - ад 100 да 1000 еўра - на лакальныя праекты: культурныя мерапрыемствы, адукацыйныя ініцыятывы, экалагічныя акцыі, медыя.
- Стварэнне моладзевых інкубатараў у гарадах і рэгіёнах: прасторы для сустрэч, навучання і працы з базавай тэхнікай, юрыдычнай і бухгалтарскай падтрымкай.
- Развіццё школьных і студэнцкіх бюджэтаў удзелу, калі навучэнцы могуць самі выбіраць, на што выдаткаваць частку сродкаў: на ініцыятывы, абсталяванне, падзеі.
- Увядзенне фаст-трэку для рэалізацыі моладзевых праектаў - спрошчаны механізм рэгістрацыі і ацэнкі ініцыятывы, без палітычных фільтраў.
- Навучальныя праграмы па грамадзянскай актыўнасці і праектным менеджменце, адаптаваныя пад беларускія ўмовы.
- Платформа «Моладзь робіць» - анлайн-банк ідэй, конкурс ініцыятываў, дзе лепшыя атрымліваюць рэсурсы і публічную падтрымку.

## 5. Культура, мова і медыя - месца для самарэалізацыі і свабоды

Праблема: культурная і інфармацыйная прастора Беларусі амаль цалкам кантралюецца дзяржавай. Замест разнастайнасці - цэнзура. Замест падтрымкі маладога творцы - прапаганда. Замест беларускай мовы і культуры - савецкі наратыў і русіфікацыя. Моладзь часта вымушаная шукаць сябе па-за межамі краіны або цалкам губляе сувязь з нацыянальнай ідэнтычнасцю.

Доступ да стварэння медыя і творчасці вельмі абмежаваны: няма ні пляцовак, ні фінансавання, ні ментарства. Школы і ВНУ практычна не даюць прасторы для культурнага самавыяўлення моладзі.

Міжнародныя практыкі:

- У Літве, Латвіі і Эстоніі існуюць фонды падтрымкі нацыянальных культурных ініцыятыў, дзе моладзь можа атрымліваць фінансаванне на выставы, відэа, фестывалі, даследаванні.
- У Францыі і Германіі існуюць моладзевыя культурныя цэнтры, дзе маладыя людзі могуць арганізаваць уласныя імпрэзы, выставачныя праекты, творчыя школы.
- У Польшчы, Румыніі, Харватыі дзейнічаюць школы грамадзянскай журналістыкі і блогаў, дзе моладзь вучыцца выказвацца праз новыя медыя.

Прапановы МХД:

- Падтрымка культурных ініцыятыў моладзі, асабліва тых, што звязаныя з беларускай мовай, гісторыяй і сучаснай творчасцю.
- Стварэнне ўмоваў для лакальных культурных прастораў: хабаў, студый, адкрытых сцэн, дзе моладзь можа выступаць, праяўляць сябе і вучыць іншых.
- Моладзевыя медыяінкубатары - пляцоўкі і праграмы, дзе навучаюць ствараць блогі, падкасты, відэа, працаваць з Instagram, TikTok, YouTube без цэнзуры.
- Конкурсы і рэзідэнцыі для маладых творцаў: пісьменнікаў, рэжысёраў, музыкаў, актывістаў, асабліва з рэгіёнаў.
- Інтэграцыя медыяадукацыі ў школы і ВНУ, каб навучыць моладзь не толькі спажываць інфармацыю, але і ствараць яе адказна.
- Асобны фокус на папулярызацыю беларускай мовы і культуры сярод моладзі, у тым ліку праз гульні, мемы, шорты, кліпы, коміксы, падкасты.

## 6. Палітычны ўдзел моладзі - не «пасля 30», а з першых крокаў

Праблема: у Беларусі моладзі амаль цалкам забаронены ўдзел у палітычным жыцці. Афіцыйна ўдзел дазволены, але на практыцы школьнікаў і студэнтаў палохаюць, ціснуць на іх, выганяюць з

навучальных установ за грамадзянскую актыўнасць. У выніку маладыя людзі перастаюць верыць, што маюць права на голас, што іх выбар важны, што палітыка можа быць інструментам зменаў.

Пры гэтым нават у дэмакратычным асяроддзі моладзь часта не ўключаецца ў прыняцце стратэгічных рашэнняў. Яна застаецца дэкаратыўнай часткай «пры мерапрыемствах» або выконвае тэхнічную ролю.

Міжнародныя практыкі:

- У Германіі і Нідэрландах моладзь з 16 гадоў можа ўдзельнічаць у муніцыпальных выбарах, а моладзевыя парламенты рэальна ўплываюць на мясцовыя рашэнні.
- У Чэхіі і Эстоніі існуюць школы грамадзянскай актыўнасці, дзе навучаюць механізмам уплыву на палітыку.
- У Францыі і Польшчы моладзевыя грамадскія арганізацыі маюць права ўдзелу ў камітэтах пры парламенце і міністэрствах.

Прапановы МХД:

- Увядзенне адукацыі па грамадзянскіх правах і механізмах уплыву з сярэдняй школы: што такое выбары, як працуе парламент, як стварыць петыцыю, як правесці кампанію.
- Стварэнне моладзевых кансультатыўных рад пры самакіраванні, парламенце, міністэрствах - з правам выносіць ініцыятывы і аналізаваць рашэнні.
- Падтрымка маладых лідараў праз стажыроўкі ў ЕС, дэмакратычных інстытутах, моладзевых парламентах.
- Адкрытыя форумы моладзевых дэмакратычных арганізацый, каб яны маглі ўзгадняць пазіцыі, уплываць на стратэгіі, не адчуваючы сябе дадаткам да «старэйшых».
- Моладзевыя дні ў парламенце і муніцыпалітэце як інструмент уключэння падлеткаў і студэнтаў у рэальныя працэсы.
- Стварэнне доўгатэрміновай нацыянальнай праграмы «Палітычны старт» для падрыхтоўкі маладога пакалення дэпутатаў, экспертаў, менеджараў грамадскай палітыкі.

## 7. Моладзь у эміграцыі: каналы ўплыву, падтрымка, сувязь з Беларуссю

Праблема: сотні тысяч маладых беларусаў сёння жывуць па-за межамі краіны. Гэта і студэнты, і актывісты, і маладыя спецыялісты. Шмат хто з іх захаваў актыўную грамадзянскую пазіцыю, веды, кантакты і жаданне дапамагаць Беларусі. Але яны часта застаюцца без зваротнай сувязі з дэмакратычнымі сіламі, не маюць інструментаў уплыву, не ведаюць, як далучыцца да супольных дзеянняў. У выніку моладзь у эміграцыі альбо поўнасцю інтэгруецца ў жыццё прымаючай краіны, альбо апынаецца ў сітуацыі «паміж»: без уплыву і без бачання сваёй ролі.

Міжнародныя практыкі: украінская, літоўская, армянская дыяспары стварылі ўстойлівыя сеткі моладзевых арганізацый за мяжой, якія не толькі падтрымліваюць нацыянальную ідэнтычнасць, але і актыўна ўплываюць на палітыку. У многіх краінах моладзь у эміграцыі мае каналы для ўключэння ў прыняцце рашэнняў праз анлайн-форумы, кансультацыйныя рады, спецыялізаваныя фонды падтрымкі дыяспары.

Што прапануем:

- Інстытуцыянальнае прадстаўніцтва. Стварэнне Моладзевага савета пры дэмакратычных сілах Беларусі, рашэнні якога абавязковыя да разгляду ў частцы моладзевай палітыкі. У яго склад павінны ўваходзіць прадстаўнікі беларускіх моладзевых ініцыятыў, студэнцкіх арганізацый, НДА і рэгіянальных супольнасцяў у эміграцыі. Гэта будзе пляцоўка для ўплыву, абмеркавання, супрацы і легітымнага прадстаўніцтва.

- Камунікацыйная інфраструктура. Стварэнне пастаянна дзеючых каналаў сувязі паміж моладдзю ў эміграцыі і ўнутры краіны праз медыя, анлайн-форумы, адукацыйныя платформы, агульныя мерапрыемствы і кааліцыйныя ініцыятывы.
- Праграмы падтрымкі. Фінансаванне і арганізацыйная падтрымка беларускіх моладзевых праектаў за мяжой - у сферы культуры, адукацыі, гісторыі, мовы, медыя, псіхалагічнай дапамогі і правоў чалавека.
- Інтэграцыя і роля ў будучыні. Удзел моладзі ў эміграцыі ў выпрацоўцы бачання новай Беларусі: канстытуцыйная рэформа, адукацыя, аднаўленне інстытутаў. Гэта ўключэнне павінна быць не сімвалічным, а рэальным, з правасуб'ектнасцю і голасам.

Для сотняў тысяч беларусаў у эміграцыі, асабліва маладых, адсутнасць уключэння ў нацыянальныя працэсы стварае адчуванне пустэчы і страты ідэнтычнасці. Але беларуская моладзь за мяжой - гэта не «страчанае пакаленне», а рэсурс, які можа стаць асновай аднаўлення дэмакратычнай Беларусі.

Мы лічым, што беларуская моладзь у эміграцыі павінна мець рэальныя каналы ўплыву, магчымасці ўдзелу і падтрымку для самарэалізацыі і захавання сувязі з краінай.

Што мы ўжо робім - практыка МХД:

- прадстаўніцтвы ў 6 краінах і 11 гарадах, каардынацыя лакальных суполак;
- кансультацыі і ментарынг для студэнтаў, ахвяр рэпрэсій і маладых лідараў: больш за 100 кейсаў;
- суправаджэнне візавай падтрымкі, адукацыйных праграм, Праграмы Каліноўскага, гуманітарных маршрутаў;
- удзел у міжнародных платформах у Бруселі, Вільні, Варшаве і іншых гарадах, а таксама ў дыялогах з палітыкамі;
- кампаніі падтрымкі моладзі, незалежных прафсаюзаў і беларускіх студэнтаў.

Што мы прапануем:

- Моладзевы савет пры дэмакратычных сілах, рашэнні якога будуць абавязковымі для каардынацыі моладзевай палітыкі.
- У яго павінны ўваходзіць прадстаўнікі моладзевых арганізацый, студэнцкіх ініцыятыў, культурных суполак.
- Савет вызначае прыярытэты падтрымкі, медыя, адукацыйных і палітычных праектаў.
- Фінансаванне малых ініцыятыў і мікрагранты - для лакальных суполак у Польшчы, Літве, Чэхіі, Украіне.
- Адукацыйныя і медыяплатформы: запуск падкастаў, блогаў, шортаў, якія будуць паказваць, «як не згубіцца» за мяжой і «як не згубіць Беларусь у сабе».
- Платформа вяртання: дапамога ў планаванні вяртання ці гібрыднага ўдзелу ў беларускай трансфармацыі.
- Пляцоўка абмену вопытам і інфармацыяй праз каардынацыю з іншымі беларускімі суполкамі, у тым ліку з уцекачамі з Украіны і іншымі групамі.

Наша візія: беларуская моладзь у эміграцыі - гэта не «ахвяры сістэмы», а супольнасць будучыні. Яны не мусяць быць спажыўцамі «дапамогі»; яны - суб'екты пераменаў, здольныя прымаць рашэнні, уплываць і будаваць сваю Беларусь там, дзе яны ёсць.

# V. Што мы прапануем для будучага дэмакратычнага парламента

Платформа Маладых хрысціянскіх дэмакратаў не з'яўляецца толькі пералікам праблем або візіяй будучыні. Гэта дакладны пералік крокаў, якія мы прапануем рэалізоўваць праз заканадаўства, інстытуцыйныя рэформы і палітычныя дзеянні. Усе наступныя прапановы рэалістычныя, праходзілі тэставанне ў іншых краінах і могуць быць адаптаваныя да беларускіх умоў у перыяд пераходу.

## 1. Закон «Аб моладзі і моладзевай палітыцы»

Мэта: стварыць прававую аснову, якая вызначае статус моладзі, яе правы, інструменты ўдзелу і дзяржаўныя гарантыі падтрымкі.

Ключавыя нормы:

- вызначэнне паняцця «моладзь» - асобы 14-31 года;
- замацаванне прынцыпаў субсідыярнасці, самакіравання, права на ўдзел;
- гарантыі роўнага доступу да адукацыі, працы, культуры, сацыяльнай падтрымкі;
- дзяржаўнае фінансаванне моладзевых арганізацый праз празрысты конкурс;
- падтрымка моладзевых ініцыятыў і інкубатараў праектаў.

## 2. Закон «Аб першым працаўладкаванні»

Мэта: ліквідаваць бар'еры для ўваходу на рынак працы для выпускнікоў і маладых спецыялістаў.

Ключавыя нормы:

- адмова ад прымусовага размеркавання;
- праграма «першае месца працы» з падтрымкай для працадаўцы і супрацоўніка: субсідыі, страхоўкі, коучынг;
- дзяржаўная сістэма ментарства і стажыровак для маладых;
- гарантыі мінімальнага заробку для першай працы і страхаванне ад эксплуатацыі.

## 3. Закон «Аб падтрымцы маладых сем'яў»

Мэта: стымуляваць стварэнне сям'і і ўмовы для выхавання дзяцей.

Ключавыя нормы:

- субсідаваная іпатэка для маладых сем'яў;
- праграма дзяржаўных і муніцыпальных арэндных кватэр;
- бясплатныя садкі для дзяцей з маладых сем'яў;
- гарантыі працы для бацькоў у дэкрэце;
- падатковыя ільготы для маладых сем'яў.

## 4. Закон «Аб моладзевых самакіраваннях»

Мэта: надаць рэальныя паўнамоцтвы студэнцкім, школьным і муніцыпальным моладзевым радам.

Ключавыя нормы:

- прызнанне студэнцкіх саветаў як легітымных органаў уплыву ў ВНУ;

- бюджэт удзелу для школьнікаў і студэнтаў: на мерапрыемствы, праекты, інфраструктуру;
- стварэнне муніцыпальных моладзевых саветаў з правам кансультацый і ўдзелу ў рашэннях.

# VI. План дзеянняў

Платформа павінна перайсці з узроўню канцэпцыі ў практычную працу. Для гэтага неабходныя паслядоўныя крокі, якія могуць быць рэалізаваныя ўжо цяпер - у Беларусі, у эміграцыі, у міжнароднай супрацы і ўнутры дэмакратычнага руху.

## Крок 1. Сетка камунікацыі моладзевых ініцыятыў

Першая задача - злучыць моладзевыя групы, студэнцкія супольнасці, культурныя і медыйныя ініцыятывы, валанцёрскія праекты, а таксама беларускую моладзь у розных краінах. Такая сетка павінна стаць не чарговым спісам кантактаў, а пастаянным механізмам абмену інфармацыяй, каардынацыі і салідарнасці.

## Крок 2. Альтэрнатыўныя адукацыйныя платформы

Асобны кірунак - развіццё альтэрнатыўных адукацыйных платформаў па гісторыі, грамадзянскай асвеце, правах чалавека, медыяпісьменнасці, беларускай мове, самакіраванні і палітычным удзеле. Яны павінны быць даступныя анлайн, бяспечныя для ўдзельнікаў і адаптаваныя да ўмоваў Беларусі і эміграцыі.

## Крок 3. Сістэма малых грантаў і ментарства для праектаў

Моладзевыя праекты павінны мець доступ да малых грантаў, кансультацый і ментарства. Нават невялікая падтрымка можа запусціць лакальнае медыя, культурную ініцыятыву, студэнцкую суполку, адукацыйны курс або праект салідарнасці.

## Крок 4. Уключэнне беларускай моладзі за мяжой у адзіную платформу ўдзелу

Моладзь у эміграцыі павінна быць уключаная ў агульную сістэму ўдзелу, а не існаваць асобна ад моладзі ў Беларусі. Для гэтага патрэбныя агульныя каналы камунікацыі, сумесныя мерапрыемствы, прадстаўніцтва ў моладзевых органах і магчымасць уплываць на парадак дня дэмакратычных сіл.

## Крок 5. Публічныя маніфесты, дэкларацыі і ўплыў на міжнародны ўзровень

МХД будуць прасоўваць публічныя маніфесты, дэкларацыі і палітычныя прапановы, каб праблемы беларускай моладзі гучалі не толькі ўнутры беларускай супольнасці, але і на міжнародным узроўні: у Еўрапейскім парламенце, нацыянальных парламентах, фондах, універсітэтах, моладзевых палітычных сетках і міжнародных арганізацыях.

# VII. Фінансаванне і супрацоўніцтва

Рэалізацыя моладзевай платформы патрабуе рэсурсаў, але гэтыя рэсурсы павінны быць звязаныя з прынцыпамі празрыстасці, конкурснасці і адказнасці перад супольнасцю. Фінансаванне не павінна замяняць ініцыятыву; яно павінна адкрываць магчымасці для тых, хто ўжо гатовы дзейнічаць.

## Крыніцы рэсурсаў

- Партнёрства з еўрапейскімі і міжнароднымі фондамі.
- Інвестыцыйныя і адукацыйныя праграмы для моладзі.
- Еўрапейскія фонды і праграмы падтрымкі моладзі, адукацыі, культуры, валанцёрства і грамадзянскай супольнасці.
- Супрацоўніцтва з універсітэтамі, муніцыпалітэтамі, моладзевымі НДА і дыяспарнымі арганізацыямі.
- Падтрымка беларускіх і міжнародных партнёраў, якія зацікаўленыя ў развіцці новага пакалення беларускіх лідараў.

## Прынцыпы фінансавання

- празрыстыя конкурсы;
- незалежныя камісіі;
- адкрытыя крытэрыі адбору;
- фінансавыя справаздачы;
- недапушчэнне палітычнай манапалізацыі рэсурсаў;
- падтрымка лакальных і рэгіянальных ініцыятыў, а не толькі буйных цэнтраў.

## Роля мясцовага самакіравання і моладзевых НДА

У будучай дэмакратычнай Беларусі мясцовае самакіраванне павінна стаць адным з галоўных партнёраў моладзі. Менавіта на мясцовым узроўні лепш за ўсё відаць, якія праекты патрэбныя школе, універсітэту, раёну, гораду або лакальнай супольнасці. Моладзевыя НДА павінны мець права ўдзельнічаць у распрацоўцы бюджэтаў, праграмаў падтрымкі і ацэнцы вынікаў.

# VIII. Як гэта рэалізаваць: інструменты, партнёры, механізмы

Каб моладзевая платформа не засталася наборам добрых намераў, неабходна сфарміраваць працаздольную сістэму рэалізацыі - з выразным падзелам адказнасці, інструментамі падтрымкі, каардынацыяй і рэсурсамі.

## 1. Партнёрствы і каардынацыя

Хто:

- беларуская дэмакратычная супольнасць: арганізацыі, ініцыятывы, лідары;
- міжнародныя партнёры: EU4Youth, UNDP, Erasmus+, Heinrich Böll Stiftung і іншыя;
- незалежныя адукацыйныя, медыя- і грамадскія платформы.

Як: стварэнне Моладзевай каардынацыйнай групы пры дэмакратычных сілах, куды ўвойдуць прадстаўнікі моладзевых ініцыятыў, грамадскіх арганізацый, а таксама каардынатар з мандатам прадстаўлення інтарэсаў моладзі на міжнародных пляцоўках. Група распрацоўвае і адсочвае рэалізацыю моладзевай стратэгіі, арганізуе канферэнцыі, слуханні, прапануе адзіныя пазіцыі па пытаннях палітыкі.

## 2. Праграмы падтрымкі моладзевых ініцыятыў

Што канкрэтна:

- фонд міні-грантаў да 3000 еўра для лакальных праектаў: адукацыйных, культурных, медыйных, сацыяльных;
- праграма развіцця моладзевых лідараў: трэнінгі, стажыроўкі, ментарства;
- конкурсы і акселератары моладзевых праектаў;
- падтрымка беларускіх студэнцкіх дыяспарных арганізацый у Польшчы, Літве, Грузіі і іншых краінах.

Хто рэалізуе: сумесна дэмакратычныя ініцыятывы, міжнародныя партнёры і мясцовыя моладзевыя арганізацыі. Асаблівая ўвага - празрыстасці: адкрытыя конкурсы, незалежнае журы, фінансавыя справаздачы.

## 3. Адукацыйныя і інфармацыйныя платформы

Мэты:

- замена або альтэрнатыва дзяржаўнай сістэме «выхавання»;
- фарміраванне кампетэнцый: як ствараць праекты, як працаваць з медыя, як удзельнічаць у палітыцы;
- абарона ад прапаганды.

Што патрэбна:

- анлайн-школы па грамадзянскай адукацыі;
- відэакурсы па еўрапейскіх каштоўнасцях, правах чалавека, эканоміцы, самакіраванні;
- моладзевыя медыя з удзелам саміх маладых людзей;
- партнёрства з платформамі накшталт Prometheus, EdEra, Mova Nanova.

## 4. Інстытуцыйная прысутнасць і прадстаўніцтва моладзі

Механізмы:

- стварэнне Моладзевага савета пры дэмакратычных сілах, чые рашэнні з'яўляюцца абавязковымі па пытаннях моладзевай палітыкі;
- рэгулярныя слуханні, кансультацыі, агульнанацыянальныя «моладзевыя сесіі»;
- прадстаўніцтва моладзі ў пераходных органах улады ў будучыні, у тым ліку ў пераходным урадзе, калі ён будзе сфарміраваны.

Практыка ЕС: у шэрагу краін Еўропы моладзевыя рады маюць не толькі дарадчую, але і прававую функцыю. У Германіі моладзь удзельнічае ў планаванні бюджэтаў у муніцыпалітэтах, у Францыі існуюць нацыянальныя моладзевыя кансультацыі пры парламенце.

## 5. Інтэграцыя з еўрапейскімі і міжнароднымі праграмамі

Мэты:

- доступ да магчымасцяў для навучання, стажыровак, валанцёрства;
- фінансаванне, інстытуцыйная падтрымка, легітымацыя моладзевай палітыкі.

Канкрэтныя крокі:

- рэгістрацыя і акрэдытацыя беларускіх моладзевых ініцыятыў у праграмах Erasmus+, European Solidarity Corps, Youth Guarantee;
- удзел у EYE (European Youth Event) і іншых моладзевых форумах;
- стварэнне альтэрнатыўнага Нацыянальнага агенцтва па моладзевым супрацоўніцтве - у эміграцыі або як сеткавая структура.

# IX. Інструменты і рэалізацыя

## 1. Партнёрствы і супраца

Міжнародныя партнёры. Міжнародныя арганізацыі і фонды - гэта не толькі крыніцы рэсурсаў, але і прастора даверу і абмену досведам. Наша стратэгія - не прасіць дапамогі, а ствараць узаемавыгадныя партнёрствы з такімі партнёрамі, як:

- YEPP (Youth of the European People's Party), Junge Union (Германія), KDU-ČSL Youth (Чэхія) - для абмену досведам, удзелу ў форумах, супольных кампаніях;
- European Democrat Students - для падтрымкі студэнцкіх суполак і міжнародных адукацыйных кампаній;
- іншыя еўрапейскія моладзевыя, студэнцкія, хрысціянска-дэмакратычныя і грамадзянскія сеткі.

Роля міжнародных партнёраў:

- адкрыццё доступу да Еўрапейскага парламента, уплывовых медыя, адукацыйных праграм;
- сумесная распрацоўка моладзевых праектаў і платформаў;
- лабіраванне інтарэсаў беларускай моладзі на міжнародным узроўні.

Беларускія партнёры ў эміграцыі. Мы наладжваем каардынацыю з:

- студэнцкімі дыяспарнымі ініцыятывамі ў Польшчы, Літве, Германіі, Чэхіі;
- культурнымі праектамі і ментарскімі праграмамі;
- беларускімі медыя і праваабарончымі платформамі;
- ініцыятывамі падтрымкі рэпрэсаваных студэнтаў.

## 2. Моладзевы савет пры дэмакратычных сілах

Механізм стварэння:

- адкрыты конкурс на ўдзел;
- прадстаўніцтва моладзевых арганізацый, ініцыятыў, студэнцкіх груп з Беларусі і дыяспары;
- прынцып субсідыярнасці: рашэнні прымаюцца на ўзроўні, бліжэйшым да моладзі.

Функцыі савета:

- распрацоўка і прапанаванне рашэнняў па ўсіх пытаннях, што датычацца моладзі;
- ацэнка палітыкі дэмакратычных сіл з гледзішча інтарэсаў моладзі;
- узгадненне медыякампаній і стратэгій удзелу моладзі ў палітыцы.

Паўнамоцтвы:

- абавязковы ўдзел у абмеркаваннях дакументаў, платформаў, рашэнняў у рамках дэмакратычных структур;
- магчымасць вета па пытаннях, дзе няма прадстаўніцтва моладзі.

### 3. Працоўныя групы і рэгулярныя сустрэчы

Для кожнага з 7 напрамкаў ствараюцца асобныя працоўныя групы, дзе:

- фармуюцца аналітычныя запіскі і палітычныя прапановы;
- распрацоўваюцца праекты: анлайн-курсы, медыякампаніі, лобі-ініцыятывы;
- праводзяцца рэгулярныя адкрытыя сесіі для маладых актывістаў.

### 4. Каналы камунікацыі

- Адкрытая платформа зваротнай сувязі: анлайн-формы, каналы Telegram/Discord.
- Моладзевая база даных для мапавання актывістаў, ініцыятыў, экспертаў.
- Штомесячныя анлайн-форумы з дакладамі, вынікамі і запрашэннем да ўдзелу.
- Цэнтр ментарскай падтрымкі: рэгулярныя кансультацыі, інструкцыі, мапы магчымасцяў.

## X. Міжнародныя практыкі, якія можна ўжыць у Беларусі

Міжнародны досвед не павінен механічна капіявацца. Ён павінен адаптавацца да беларускіх умоў - аўтарытарнага ціску, вымушанай эміграцыі, слабасці легальных інстытутаў, патрэбы ў бяспечных каналах удзелу і адначасовай падрыхтоўкі да будучай дэмакратычнай трансфармацыі.

### Германія

Германскі досвед важны для Беларусі праз мадэлі Jugendparlament, Jugendhilfe і FSJ. Моладзевыя парламенты дазваляюць маладым людзям уплываць на мясцовую палітыку, Jugendhilfe фарміруе сістэму сацыяльнай і адукацыйнай падтрымкі, а FSJ паказвае, як валанцёрства можа быць прызнанай часткай грамадзянскага і прафесійнага развіцця.

### Польшча

Для беларускай моладзі, асабліва ў эміграцыі, важны польскі досвед Rada Dzieci i Młodzieży і еўрапейскага валанцёрства. Польшча таксама можа быць практычнай базай для адукацыйных праграм, студэнцкіх ініцыятыў, кансультацый і інтэграцыі беларускай моладзі ў еўрапейскія сеткі.

### Скандынавія

Скандынаўскія краіны паказваюць, як бюджэт удзелу, школьныя саветы з рэальнымі паўнамоцтвамі і давер да лакальных супольнасцяў могуць фарміраваць культуру адказнасці. Для Беларусі гэта асабліва важна ў кантэксце будучага аднаўлення мясцовага самакіравання.

### Еўрапейскі саюз

Праграмы Erasmus+, European Solidarity Corps, DiscoverEU, EYP і іншыя еўрапейскія інструменты могуць стаць не толькі магчымасцямі для асобных маладых людзей, але і асновай для доўгатэрміновай інтэграцыі беларускай моладзі ў еўрапейскую адукацыйную, культурную і грамадзянскую прастору.

## XI. Заключэнне: час дзейнічаць

Мы не прапануем пустыя абяцанні, не абвяшчаем «уладу праз пяць гадоў» і не будуем ілюзій. Мы - маладыя людзі, якія ведаюць, як выглядае Беларусь сёння і якой яна быць не павінна. Мы не проста

супраць старой сістэмы - мы за новае бачанне, заснаванае на каштоўнасцях хрысціянскай дэмакратыі, міжнародным досведзе і нашым уласным вопыце змагання, навучання, салідарнасці.

Моладзь - не будучыня, а сучаснасць. Яна ўжо цяпер гатовая несці адказнасць, прапаноўваць рашэнні, удзельнічаць у фарміраванні стратэгій. І калі яе не чуюць, Беларусь губляе не толькі галасы, але і будучых лідараў, стваральнікаў, абаронцаў.

Мы ведаем, што трэба рабіць. У нас ёсць досвед падтрымкі рэпрэсаваных студэнтаў, стварэння незалежных структур, удзелу ў палітычных кампаніях і міжнародных праграмах. Мы не тэорыя - мы практыка.

Мы чакаем не дазволу, а партнёрства. Моладзь павінна быць паўнавартаснай часткай дэмакратычнага руху, а не інструментам для дэкарацый. Таму мы заклікаем усе дэмакратычныя сілы прызнаць і інстытуцыяналізаваць ролю моладзі, а міжнародных партнёраў - гарантаваць, што падтрымка беларускай дэмакратыі не абміне яе маладое пакаленне.

МХД гатовыя працягваць змаганне. У Беларусі, у эміграцыі, у адукацыйных, культурных, медыйных, палітычных праектах. І мы адкрытыя для ўсіх, хто падзяляе гэтыя каштоўнасці.

Мы ведаем, што будучыня - гэта тое, што пачынаецца сёння. І мы ўжо пачалі.